АРК

# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

## № 4(50) 2006

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

## Змест

*Галоўны рэдактар:*
**П. Дз. Кухарчык**

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік

Весці БДПУ
№4(50) сер2.

### Гісторыя

*Бушчык Г. П.* Унутрысаюзныя сувязі БССР па ўвозе і вывазе прамысловай прадукцыі ў 70—80-я гг. XX ст. ........ 3

*Барабаш Н. В.* Віды і формы міграцыйных працэсаў у БССР у першыя пасляваенныя гады (1945—1950-я гг.) ........ 9

*Якаўчук В. І.* Аднаўленне і развіццё пажарнага добраахвотніцтва Беларусі ў пасляваенныя гады (1944—1957 гг.) ........ 12

*Юрчак Дз. В.* Беларуска-ўкраінскае двухбаковае супрацоўніцтва ў галіне культуры, навукі і адукацыі ў 1991—2004 гг. ........ 15

*Пуцік У. С.* Падзенне ролі Рускай Праваслаўнай Царквы ў сацыяльнай сферы і рост яе палітычнай актыўнасці ў Беларусі ў пачатку XX ст. ........ 19

*Дрывень І. І.* Дзейнасць франтавых камітэтаў УЗС і УСГ па аказанні дапамогі арміі і насельніцтву ........ 23

*Шкуцько Л. Л., Драздова К. А.* Станаўленне капіталістычных банкаў на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX — пачатку XX ст. ........ 27

*Пракаповіч Л. Э.* Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі фабрычна-заводскай прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст. ........ 31

*Сянькевіч А. І.* Барацьба са злачыннасцю падлеткаў у канцы XIX — пачатку XX стст. і яе сувязь са станаўленнем заканадаўства аб ахове правоў дзіцяці ........ 35

*Доўнар Л. А.* Крэдытная палітыка савецкай дзяржавы адносна прыватнай вытворчасці ў Беларусі перыяду НЭПа ........ 38

*Крывіцкі Д. С.* Дыскрэдытацыя партызанскага руху ў Беларусі германскімі спецслужбамі: лжэпартызанскія атрады ........ 43

*Вінніца Г. Р.* Выратаванне яўрэяў Праведнікамі на акупіраванай тэрыторыі Усходняй Беларусі ........ 46

*Старычонак В. В.* Эвалюцыя амерыканскай грамадскай думкі па пытанні аб пачатку вайны супраць Ірака (жнівень 1990 — студзень 1991 г.) ........ 49

*Варывончык І. В.* «Неакансерватыўная рэвалюцыя» Рональда Рэйгана ........ 54

*Цзян-Шу-і.* Праблема Тайваня ў савецка-кітайскіх адносінах (другая палова 40-х — 50-я гг. XX ст.) ........ 58

### ...асофія

*...сюк У. Ф.* Феномен чалавека: адзінства цэласнасці ...чнасці ........ 63

*...яцюк В. В.* Беларускі менталітэт як аснова грамадзянскай ...дамасці ........ 67

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

21. Отчет Государственного дворянского земельного банка за 1906 г. — СПб, 1907.
22. Отчет Игуменского городского общественного банка за 1906 г. — Игумен, 1907.
23. Отчет Крестьянского поземельного банка за 1907 г. — СПб, 1909.
24. Отчет Пинского общества взаимного кредита за 1912 г. — Пинск, 1913.
25. Отчет правления Минского коммерческого банка на общем собрании акционеров 25 апреля 1876 г. // Минские губернские ведомости. — 1876.
26. Отчет Слуцкого общества взаимного кредита за 1912 г. — Слуцк, 1913.
27. Очерки развития финансов дореволюционной Белоруссии / под общ. ред. Л. А. Рубанова и З. И. Гиоргидзе. — Минск : Выш. шк., 1970. — 208 с.
28. *Панютич, В. П.* Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг. / Институт истории АН БССР. — Минск : Наука и техника. — 373 с.
29. Русские банки. Справочные и статистические сведения о всех действующих в России государственных, частных и общественных кредитных учреждениях / сост. А. К. Голубев. — СПб, 1899.
30. Сборник циркуляров, изданных Государственным банком для казначейств по ведению ими банковских операций (с 1 января по 1 октября 1915). — Петроград, 1915.
31. Список частных банков, которым (на 1 апреля 1914 г.) открыты кредиты в конторах и отделениях Государственного банка. — СПб, 1915.
32. *Вдовин, А. В.* Крестьянский поземельный банк (1883—1895). / А. В. Вдовин. — М.: Госфиниздат, 1959. — 106 с.
33. Устав Минского городского кредитного общества. — Минск, 1909.
34. *Тимошенко, В. В.* Кредитная система Белоруссии в начале XX в./ В. В. Тимошенко // Исторические записки. — 1965. — № 78. — С. 61—84.
35. *Шелкунова, Е. А.* Банковские здания Минска — свидетели истории // Е. А. Шелкунова // Банкаўскі веснік. — 2004. — № 16. — С. 56 — 58.
36. *Шибеко, З. В.* Минск в конце XIX — начале XX в.: страницы социально-экономического развития / З. В. Шибеко — Минск, 1985. — 136 с.



*SUMMARY*

*This article is devoted to the history of the first Belarusian banks from their appearance (1870) till 1914. After the financial reforms (1859—1861) a new credit system appeared. Being the part of Russian economics Belarusian banks developed greatly and could compete with state and foreign credit ones.*


*УДК [930:62](476)*

***Л. Э. Пракаповіч***

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

Даследаванне фабрычна-заводскай прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст. з'яўляецца адной з актуальных і да канца нявырашаных праблем гістарычнай навукі, нягледзячы на значную колькасць прац гісторыкаў і эканамістаў па гэтай тэме. Праблема развіцця фабрычна-заводскай вытворчасці заўсёды была асабліва важнай у гістарычнай навуцы. Айчынныя і замежныя гісторыкі ўжо некалькі дзесяцігоддзяў вядуць дыскусію па пытаннях пераходу ад феадалізму да капіталізму, аб месцы таварнай вытворчасці і яе ролі ў пераходны перыяд, аб месцы ў працэсе генезісу капіталізму фабрычна-заводскай вытворчасці і г. д.

Праблема развіцця прамысловасці ў другой палове XIX ст. адлюстравана ў працах М. Ф. Болбаса, З. Е. Абезгаўза, С. Г. Струміліна, Д. А. Дудкова, А. М. Лютага і іншых гісторыкаў.

У буржуазнай гістарыяграфіі генезісу капіталізму ў прамысловасці ў Расійскай імперыі і яе асобных рэгіёнах шмат увагі надавалася ролі гандлёвага капіталу як першай стадыі гэтага працэсу, якая змянілася пазней прамысловым капіталам. З'яўленне буйной капіталістычнай вытворчасці адносілася да першай паловы XIX ст. [1].

К. Маркс, адзначаючы наяўнасць феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў у Расіі пасля рэформы 1861 г., бачыў агульную тэндэнцыю сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны па капіталістычным шляху, якая «…очутившись в лоне буржуазного общества… будет подчинена его неумолимым законам…» [2].

У. І. Ленін з марксісцкіх пазіцый спрабаваў даць характарыстыку трох стадый развіцця капіталізму ў прамысловасці ў Расійскай імперыі і яе асобных рэгіёнах: простай капіталістычнай кааперацыі, капіталістычнай мануфактуры і фабрычна-заводскай вытворчасці, адзначаючы, што «…поглощение мелких заведений мануфактурой и фабрикой есть утилизация крупным капиталом этой подготовленной почвы» [3, с. 344—345].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

У працы «Историко-статистический обзор промышленности России» пад рэдакцыяй Дз. А. Ціміразева (СПб., 1885—1886. Т. 1—2. Вып. 1—4) і манаграфіі М. І. Туган-Бараноўскага ўтрымліваецца вялікі фактычны матэрыял па гісторыі развіцця прамысловасці ў XIX ст., аднак зусім не размежаваны паняцці «мануфактура» і «фабрыка» [4].

У працах П. А. Арлова [5] утрымліваецца фактычны матэрыял па гісторыі фабрычна-заводскай прамысловасці Беларусі ў XIX ст., аднак гэтыя даныя не заўсёды поўныя і дакладныя.

М. В. Доўнар-Запольскі, які даследаваў эканоміку Беларусі з 1861 па 1914 гг., адносіць пачатак генезісу капіталізму толькі к 80-м гг. XIX ст., не заўважаючы яго парасткаў у больш раннім перыядзе [6].

У 1944 г. выходзіць манаграфія С. Г. Струміліна «Промышленный переворот в России», у якой аўтар спрабаваў абгрунтаваць храналагічныя межы прамысловага перавароту ў Расійскай імперыі перыядам позняга феадалізму, а дакладней 30—50-я гг. XIX ст. [7, с. 14]. Распрацоўка гэтай праблемы пацягнула за сабой і абмеркаванне пытанняў, звязаных з праблемай генезісу капіталізму ў прамысловасці: этапы развіцця, характар мануфактуры ў Расійскай імперыі і замена яе капіталістычнай фабрыкай. Вялікае значэнне для даследуемай праблемы меў выхад шэрага прац па гісторыі эканомікі [8].

Для гісторыкаў, якія займаюцца пытаннямі, звязанымі з генезісам капіталізму ў прамысловасці ў нацыянальных рэгіёнах Расійскай імперыі, у тым ліку ў Беларусі, быў характэрны перанос агульнарасійскіх характарыстык сацыяльна-эканамічных працэсаў на мясцовую глебу, а таксама імкненне вызначыць з дапамогай новых крыніц агульныя заканамернасці пераходу ад феадалізму да капіталізму.

У манаграфіі З. Е. Абезгаўза, прысвечаной развіццю прамысловасці і фарміраванню пралетарыяту ў Беларусі ў другой палове XIX ст., дадзена павярхоўная характарыстыка фабрычна-заводскай вытворчасці, а асноўная ўвага нададзена працэсу фарміравання рабочага класа і яго барацьбе, што было характэрна для большасці прац савецкага перыяду па гістарыяграфіі [9]. У манаграфіі А. І. Воранавай ёсць даныя аб развіцці прамысловасці ў Беларусі ў канцы XIX ст. [10].

Зрабіўшы дастаткова правільны вывад аб тым, што «...промышленность Беларуси и в 1860 г. не достигла общероссийского уровня» [11, с. 204], М. Ф. Болбас у наступнай сваёй манаграфіі адмаўляецца ад уласнага вываду і ў доказ свайго новага прама супрацьлеглага сцвярджэння па незразумелых прычынах і без усялякага тлумачэння прыводзіць даныя, адрозныя ад тых, што ўтрымліваліся ў яго першай кнізе аб стане прамысловасці ў Беларусі: па колькасці рабочых «новыя» звесткі большыя ў 4,5 раза і па суме вытворчасці — у 2,3 раза [12, с. 93]. Аўтар «лёгка і свабодна» аперыруе лічбамі, таму, відаць, не выпадкова табліцы М. Ф. Болбаса складзены без спасылак на крыніцы [13, с. 240—258], бо ніхто не гарантуе іх дакладнасці, у тым ліку сам аўтар.

Шырокае кола пытанняў, якія даследуе аўтар, не дазволіла яму прасачыць увесь працэс грамадскага падзелу працы, гэта значыць стварэння базы для падзелу фабрычна-заводскай вытворчасці.

У апошнія гады выйшла некалькі манаграфічных даследаванняў, аўтары якіх закранаюць асобныя бакі праблемы месца і ролі фабрычна-заводскай прамысловасці ў працэсе генезісу капіталізму ў Беларусі [14].

Дэталёвы археаграфічны і крыніцазнаўчы аналіз выданняў дакументаў па гісторыі Беларусі парэформеннага перыяду ўтрымліваецца ў працах А. П. Ігнаценкі і З. Ю. Капыскага [15].

Асаблівае значэнне для даследавання дадзенай праблемы маюць агляды стану гарадоў і статыстычныя зборнікі агульнарасійскага маштабу. Часта статыстычныя звесткі выклікаюць сумненні, бываюць супярэчлівыя і недакладныя, таму па магчымасці іх неабходна праверыць і ўдакладніць першаснымі архіўнымі данымі, гэта значыць мясцовымі матэрыяламі, якія былі першаасновай для складання справаздач і статыстычных табліц.

Асноўнай крыніцай па дадзенай праблеме з'яўляюцца архіўныя матэрыялы з фондаў Расійскага дзяржаўнага архіва ў Санкт-Пецярбурзе (РДГА), Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску (НГАБ), Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродне (НГАБ у Гродне), Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы (НГАЛ). Праўда, многія архіўныя матэрыялы РДГА дубліруюць даныя НГАБ у Мінску і Гродне, аднак асобныя фонды істотна дапаўняюць базу крыніц па гісторыі фабрычна-завадской прамысловасці ў другой палове XIX ст.

Матэрыялы дэпартамента мануфактур і ўнутранага гандлю [ф. 18] утрымліваюць звесткі аб колькасці выробленых і прададзеных вырабаў фабрыкамі і заводамі [16]. Праўда, В. К. Яцунскі лічыў, што звесткі гэтай установы аб прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў запісаны на 15—20% [17]. У 70—80-я гг. XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аформілася іншая ацэнка паведамленняў міністраў унутраных спраў і фінансаў, у склад якіх уваходзіў у розны час дэпартамент мануфактур і гандлю. Аўтары прыйшлі да высновы, што даныя аб мануфактурна-фабрычнай прамысловасці трэба лічыць дакладнымі, якія даволі аб'ектыўна адлюстроўвалі рэчаіснасць, гэта значыць узровень развіцця буйной прамысловай вытворчасці [18].

Звесткі аб прамысловым развіцці Беларусі прыведзены ў справаздачах губернатараў і паліцыі, якія сабраны ў фондах 13, 1263, 1274, 1284, 1297 РДГА. Першыя справаздачы губернатараў былі складзены за 1804 г. (апошнія за 1916 г.) і толькі па асобных губернях. Рабілася гэта нерэгулярна, галоўным чынам пры змене губернатараў. Сапраўдныя справаздачы губернатараў знаходзіліся ў асноўным у фондах камітэта і савета міністраў [ф. 1263 і 1276], а копіі — у фондах дэпартамента агульных спраў Міністэрства ўнутраных спраў [ф. 1281] і канцылярыі гэтага міністэрства [ф. 1282]. Па былых ускраінах Расійскай імперыі справаздачы захоўваюцца за асобныя гады ў фондах заходняга камітэта [ф. 1267] і камітэта па справах Каралеўства Польскага [ф. 1270].

Вялікай дакладнасцю даныя, што ўтрымліваюцца ў справаздачах губернатараў, не адрозніваюцца. Ва ўмовах бюракратычнай самадзяржаўнай Расіі, як адзначаюць даследчыкі, губернатары, якія з'яўляліся фактычна бескантрольнымі кіраўнікамі вялікіх раёнаў, зусім не былі зацікаўлены ў раскрыцці рэальнага стану спраў у губерні. Яны хутчэй прыхарошвалі рэчаіснасць ці замоўчвалі важныя факты, што мелі месца на ўскраінах імперыі [19].

Для статыстычных табліц у справаздачах губернатараў характэрны тыя ж недахопы, якія былі ўласцівы адміністрацыйнай статыстыцы Расійскай імперыі ўвогуле. Зборам звестак займаліся ў асноўным паліцыя (спраўнік, станавы прыстаў) і валасныя праўленні, а таксама казённыя палаты і кіраўнікі дваранства. З 1835 г. пачалі ствараліся губернскія статыстычныя камітэты, але яны бяздзейнічалі. Іх праца актывізавалася толькі пасля выдання 26 снежня 1860 г. новага палажэння аб іх [20].

Аднак большасць гісторыкаў лічыць, што такую featuresрознабаковую і насычаную фактычным матэрыялам крыніцу можна выкарыстоўваць для параўнання, паказу і аналізу дынамікі пэўнай з'явы ці працэсу (у дадзеным выпадку развіцця фабрычна-заводскай прамысловасці), а таксама для вызначэння агульных тэндэнцый і заканамернасцей [21].

У фондах Цэнтральнага статыстычнага камітэта Міністэрства ўнутраных спраў [ф. 1290] і Уласнай яго імператарскай вялікасці канцылярыі [ф. 1409] сабраны справы, якія даюць звесткі не толькі аб колькасці насельніцтва па губернях, але і аб колькасці прамысловых устаноў.

Звесткі аб развіцці прамысловасці ў XIX ст. узяты таксама з фондаў канцылярыі віленскага генерал-губернатара [ДГАЛ, ф. 378] і НГАБ у Мінску і Гродне. Асаблівае месца ў базе крыніц займаюць матэрыялы фондаў канцылярыі мінскага [ф. 295], віцебскага [ф. 1430], магілёўскага [ф. 2001] і гродзенскага [ф. 1] грамадзянскіх губернатараў.

Звесткі, якія захоўваюцца ў гэтых фондах, больш дакладныя, чым матэрыялы РДГА, бо тут захаваліся не толькі копіі справаздач, але і першасныя даныя, на аснове якіх яны складаліся. Звесткі ў справаздачах, збор якіх не быў звязаны з фіскальнымі мэтамі і якія сведчылі аб дзейнасці губернатараў (будаўніцтва дарог, функцыяніраванне кірмашоў, развіццё рамёстваў і прамысловасці), часцей за ўсё завышаліся, а звесткі, звязаныя са зборам падаткаў (колькасць падатковага сяла, купецкія капіталы і г. д.) — пазычаліся. Аднак наяўнасць першасных матэрыялаў дазваляе ўдакладніць статыстычныя даныя па даследуемай праблеме.

Некаторыя звесткі аб прамысловых прадпрыемствах узяты з фонду 333 (мінская казённая палата), а таксама з фондаў павятовых казначэйстваў [ф. 335—336, 2161, 2794 і інш.]. Цікавы фактычны матэрыял утрымліваецца ў фондах магнатаў Радзівілаў [ф. 694] і Румянцава-Задунайскага [ф. 3014].

Такім чынам, даныя шматлікіх крыніц неабходна падвяргаць параўнальнаму аналізу і матэматычнай апрацоўцы, пры гэтым улічваць наступныя прынцыпы даследавання: пабудова табліц на аснове даных шматлікіх крыніц, а не асобных фактаў; складанне дынамічных радоў статыстычных даных толькі з супастаўляльных лічбаў; увядзенне сярэдніх велічынь толькі для эканамічна аднародных супольнасцей; выкарыстанне прыёму другаснай групоўкі на аснове статыстычных даных крыніцы; спалучэнне абагульненняў прынцыповага парадку са значнай колькасцю канкрэтных дэталей; узаемасувязь вывучаемых з'яў; разгляд з'яў і працэсаў з улікам усіх сацыяльна-эканамічных, палітычных і іншых умоў развіцця фабрычна-заводскай прамысловасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ

1. *Ключевский, В. О.* Сочинения : в 8 т. / В. О. Ключевский. — М.: Госполитиздат, 1956—1959. — Т. 4: Курс русской истории. — 1958. — 422 с.; *Милюков, П. Н.* Очерки по истории русской культуры: население, экономический, государственный и сословный строй / П. Н. Милюков. — 4-е изд. — СПб. : Изд. ред. журн. «Мир божий», 1900. — 239 с.; *Туган-Барановский, М. И.* Русская фабрика в прошлом и настоящем / М. И. Туган-Барановский. — 7-е изд. — М.: Соцэкгиз, 1938. — Т. 1: Историческое развитие русской фабрики в XIX веке. — 460 с.
2. *Маркс, К., Энгельс, Ф.* Сочинения. 3-е изд. — Т. 19. — С. 120.
3. *Ленин, В. И.* Полное собрание сочинений / В. И. Ленин. — 5-е изд. — М. : Политиздат, 1979—1983. — Т. 2: 1895—1897. — 677 с.
4. *Туган-Барановский, М. И.* Русская фабрика в прошлом и настоящем / М. И. Туган-Барановский. — 3-е изд. — СПб.: Изд. Книжный магазин «Наша жизнь», 1907. — 398 с.
5. *Орлов, П. А.* Указатель фабрик и заводов Европейской России с Царством Польским и Великим княжеством Финляндским — 1-е изд. / П. А. Орлов. — СПб.: Тип. бр.- Пантелеевых, 1881. — 754 с.; *Орлов, П. А.* Указатель фабрик и заводов Европейской России и Царства Польского — 2-е изд. / П. А. Орлов. — СПб.: Тип. Р. Голике, 1887. — 824 с.
6. *Довнар-Запольский, М. В.* Народное хозяйство Белоруссии в 1861—1914 гг. / М. В. Довнар-Запольский. — Минск : Изд.Госплана БССР, 1926. — 239 с.
7. *Струмилин, С. Г.* Промышленный переворот в России / С. Г. Струмилин. — М.: Госполитиздат, 1944. — 48 с.
8. *Лященко, П. И.* История народного хозяйства: в 3 т. — 4-е изд. / П. И. Лященко. — М.: Госполитиздат, 1956. — Т. 1: Докапиталистические формации / П. И. Лященко. — 1956. — 647 с.; Т. 2: Капитализм / П. И. Лященко. — 1956. — 728 с.; *Хромов, П. А.* Экономическое развитие России в XIX—XX вв. 1800—1917 / П. А. Хромов. — М.: Тип. «Красный пролетарий», 1950. — 552 с.
9. *Абезгауз, З. Е.* Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века / З. Е. Абезгауз. — Минск : Наука и техника, 1971. — 179 с.
10. *Воранава, А. І.* Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. / А. І. Воранава. — Мінск: Выд-ва Акад.навук БССР, 1960. — 235 с.
11. *Болбас, М. Ф.* Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861 гг.) / М. Ф. Болбас. — Минск : Наука и техника, 1968. — 268 с.
12. *Болбас, М. Ф.* Промышленность Белоруссии. 1860—1900 / М. Ф. Болбас. — Минск : Изд-во БГУ, 1978. — 312 с.
13. *Болбас, М. Ф.* Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861 гг.) / М. Ф. Болбас. — Минск : Наука и техника, 1968. — 268 с.
14. *Шыбека, З. В.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX — пачатак XX ст.) / З. В. Шыбека. — Мінск: ЭўроФорум, 1997.; *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861—1914 гг. / А. П. Жытко. — Мінск : БДПУ. 2003. — 233 с.; *Люты, А. М.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII — першай палове XIX стагоддзя / А. М. Люты. — Мінск : БДПУ, 2004. — 320 с.; *Полетаева, Н. И.* Купечество Беларуси. 60-е года XIX — начало XX в. / Н. И. Полетаева. — Минск : БГЭУ, 2004. — 247 с.
15. *Игнатенко, А. П.* Введение в историю БССР: периодизация, источники, историография / А. П. Игнатенко. — Минск : Высш. шк., 1965. — 48 с.; *Копысский, З. Ю.* Сборники документов по истории Белоруссии, изданные в БССР (1921—1971 гг.) // Археографический ежегодник за 1974 год. — М., 1975. — С. 13—23.
16. ПСЗ. Т. 31. № 24714.
17. *Яцунский, В. К.* Отчеты Департамента мануфактур и внутренней торговли Министерства финансов дореформенной эпохи как исторический источник // Археографический ежегодник за 1958 г. — М., 1960. — С. 190.
18. *Рыбаков, Ю. А.* О приемах проверки достоверности ведомостей фабрик и заводов России XIX века / Ю. А. Рыбаков // Источниковедение отечественной истории. — Вып. 1. — М., 1973. — С. 296; *Ионова, В. В.* Социальный состав московских промышленников 40—50-х годов XIX века / В. В. Ионова // Проблемы истории: Вып. XIII. — М., 1983. — С. 175.
19. *Дятлова, Н. П.* Отчеты губернаторов как исторический источник / Н. П. Дятлова // Проблемы архивоведения и источниковедения : материалы науч. конф. архивистов Ленинграда. 4—6 фев. 1964 г. / ред. кол. В. В. Бедин [и др.]. — Ленинград, 1964. — С. 240.
20. *Дятлова, Н. П.* Отчеты губернаторов как исторический источник / Н. П. Дятлова // Проблемы архивоведения и источниковедения : материалы науч. конф. архивистов Ленинграда. 4—6 фев. 1964г. / ред. кол. В. В. Бедин [и др.]. — Ленинград, 1964. — С. 240.
21. *Улащик, Н. Н.* Отчеты губернаторов Литвы и Западной Белоруссии как исторический источник / Н. Н. Улащик // Проблемы источниковедения: сб. ст. — М., 1961. — Т. 9; *Нифонтов, А. С.* Статистика урожаев в России (по материалам губернаторских отчетов) / А. С. Нифонтов // Исторические записки: сб. ст. — М., 1968. — Т. 81.



SUMMARY

*The article analyses historiography of the development of plants and factories in Belarus in the 19th century, gives a survey of the sources on the problem.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ